# РЭКАНСТРУКЦЫЯ БУДЫНКАЎ У ГІСТАРЫЧНАЙ ЧАСТЦЫ ГОРАДА ВІЦЕБСКА НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

**А.К. Ярэмчык** (УА «ГДУ імя Ф. Скарыны»)
Навуковы кіраўнік – **А.Р. Яшчанка**, канд. гіст. навук, дацэнт

У пачатку 21 ст. для Віцебска характэрны значныя поспехі ў рэканструкцыі гістарычных пабудоў. Горад мае доўгую гісторыю і з'яўляецца адным з старэйшых культурных цэнтраў сучаснай Беларусі. Спачатку на Віцебскую архітэктуру ўплывала Полацкая школа дойлідства, затым сфарміравалася ўласная гарадская школа, дзякуючы якой Віцебск багаты на захаваныя рэшткі архітэктурных помнікаў. Вялікія сілы прыкладаюцца для аднаўлення архітэктурнай спадчыны горада. У дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны занесена 885 аб'ектаў нерухомасці Віцебска і Віцебскай вобласці, з іх 279 – помнікі архітэктуры. Праблема сучаснага ўзнаўлення архітэктурнай спадчыны – актуальная тэма для вывучэння.

Мэтай праведзенага даследавання з'яўляецца характарыстыка стану рэканструкцыі архітэктурных помнікаў горада Віцебска ў кантэксце сучаснага захоўвання гістарычнай спадчыны краіны.

Зараз у горадзе ажыццяўляецца інтэнсіўная рэканструкцыя архітэктурных помнікаў, сярод якіх СвятаУспенскі кафедральны сабор на Успенскай гары. Сабор знаходзіцца на месцы каменнай Успенскай царквы, пабудаванай у 1743 г. У 1936 г. сабор быў узарваны, рэстаўрацыя пачалася ў 2001 г., пасля археалагічных раскопак на месцы сабора, завяршылася ў 2011 г. Таксама да нядаўна адрэстаўраваных будынкаў адносіцца Духаўскі круглік, які быў узведзены на месцы адной з вежаў Ніжняга Замка 1330–1351 г., будаўніцтва скончылася ў 2007 г. Крыху раней, у 1999 г., адчыніла свае дзверы Дабравешчанская царква, самы старажытны архітэктурны помнік горада, пабудаваны ў 12 ст. пад уплывам Полацкай школы дойлідства. У 2009 г. была рэканструявана Васкрасенская царква па вобразу царквы 18 ст. Праект ствараўся па малюнках мастака Юзэфа Пешкі і фатаграфіях, па захаваных прэшткаў падмурка (у ходзе будаўніцтва яны знішчаны). Таксама рэстаўрацыйныя работы не абышлі адзін з галоўных помнікаў архітэктуры Віцебска – ратушу, пабудаваную на мяжы 16–17 ст. У адрозненне ад астатніх будынкаў яна падверглася нязначнай рэстаўрацыі.

Канец 20 і першае дзесяцігоддзе 21 ст. – перыяд, багаты на аднаўленне будынкаў у гістарычнай частцы Віцебска. Праца не спыняецца і зараз: была адноўлена і зменена дэльта Віцьбы, акультурана мясцовасць вакол ракі і Успенскага сабора. У горадзе праходзіць масавая рэканструкцыя будынкаў,  але некаторыя яшчэ не закранутыя ёй. У бліжэйшай перспектыве рэканструкцыя Вялікай Любавічаскай сінагогі, царквы Узвышэння Хрыста, Свята-Мікалаеўскага сабора.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ имени Ф. Скорины